**49.** Прачытайце тэкст. Дайце яму загаловак. На што ўказвае загаловак: на тэму ці на асноўную думку?

Ідзе Верасень лесам. Прыбірае ён дрэвы ў дарагія ўбо́ры. Бярозкі стаяць у золаце. Дубы адліваюць меддзю. Рабіны ўпрыгожаны чырвонымі пацеркамі.

Гарыць-палае асенні лес. Задаволены Верасень! *(Паводле К. Каліны.)*

**убо́р** — убранне, адзенне

Запішыце тэкст разам з загалоўкам.

## План тэксту

**50.** Прачытайце тэкст. Якую песню іграла дзяўчынка? Чаму ноты з песні падхапілі людзі і птушкі?

### Любімая песня

Дзяўчынка іграла на раялі. Яе пальчыкі шпарка бегалі па клавішах. Нот набралася многа-многа! Яны звонкімі гарошынамі рассы́паліся па падлозе, пакаціліся на балкон, а з балкона — на тратуар.

Па тратуары ішлі людзі. Прахожыя лавілі ноты і з добрай усмешкай неслі іх з сабой. Гэта былі іх любімыя ноты. Дзяўчынка іграла пра мір, пра дружбу, пра шчасце.



Правообладатель Национальный институт образования

Малая іграла. Нот было так многа — звонкіх, радасных, пявучых! Людзі не маглі іх сабраць. Прыляцелі птушкі, падхапілі ноты і паляцелі з імі па ўсёй зямлі. Так разнеслася песня пра мір. *(Паводле А. Кобец-Філімонавай.)*

На што ўказвае загаловак тэксту: на тэму ці на асноўную думку?

**51.** Разгледзьце малюнкі. Падзяліце тэкст практыкавання 50 на часткі.







Зачытайце часткі тэксту, якія адпавядаюць кожнаму малюнку. Падбярыце загаловак да кожнай часткі. Запішыце загалоўкі, пазначце іх лічбамі.

План

1. …
2. …
3. …

Вусна перакажыце тэкст з апорай на малюнкі і план.

**План раскрывае змест тэксту і перадае паслядоўнасць развіцця аўтарскай думкі.**



Правообладатель Национальный институт образования

**52.** Прачытайце тэкст. Што выклікала ў вас усмешку?

## Распрані яе

На ўскрайку прысядзі́бнага ўчастка Дашына бабуля пасеяла гарбузы. Восенню гарбузы выраслі вялікія-вялікія. І нават паспелі.

Хадзілі каля іх куры ды і дзяўбці́ пачалі, нават семкі лу́шчыць узяліся.

Даша ўбачыла гэта, узяла некалькі спелых семак, прыносіць да бабулі, падае́ семку і просіць:

— Распрані яе! *(Паводле П. Кавалёва.)*

**прысядзі́бны** — які знаходзіцца каля дома

На колькі частак можна падзяліць тэкст? Пра што ідзе размова ў кожнай частцы?

Пастаўце пытанні да кожнай часткі тэксту і запішыце яго план.

План

1. Калі ...?
2. Што ...?
3. Пра што ...?

Спішыце першую частку тэксту. Падкрэсліце літары, якія абазначаюць зацвярдзелыя зычныя гукі.

Пры складанні плана можна:

1) выдзяляць галоўнае ў кожнай частцы тэксту і даваць ёй назву;

2) ставіць пытанне да кожнай часткі тэксту.



Правообладатель Национальный институт образования

**53.** Разгледзьце малюнкі да беларускай народнай казкі. Прачытайце план, складзены са слоў казкі. Як называецца казка?



План

1. Ко-ко-ко, Чубатка, знайшоў зярнятка.
2. Як жа цябе, Пеця, ратаваць?
3. Карова, карова, дай масла!
4. Касцы́, касцы, дайце сена!
5. Пекар, пекар, дай пірагоў.
6. Ку-ка-рэ-ку! Чуб-чубатка — маладзец!

## *Творчая хвілінка*

Раскажыце казку «Як курачка пеўніка ратавала» з апорай на малюнкі і план.



Правообладатель Национальный институт образования

**54.** Прачытайце тэкст. Падзяліце яго на часткі. Выкарыстайце прапанаваны план.

## Запаслівая гаспадыня

Ваверка — запаслівая гаспадыня. На зіму яна робіць нарыхтоўкі з арэхаў, грыбоў, жалудоў. Восенню ў лесе часта можна ўбачыць дзіўную з'яву. На сучка́х або паміж галінкамі дрэў вісяць грыбкі. Гэта нарыхтоўкі ваверкі. Яны дапамагаюць звярку перажыць зімовыя халады.

План

1. Чаму ваверку называюць запаслівай гаспадыняй?
2. Што можна заўважыць восенню ў лесе?
3. Для чаго ваверка чапляе грыбы на сучкі дрэў?

Запішыце другую частку тэксту.

**55.** Прачытайце тэкст. Што можна ўбачыць на лясным возеры? На што ўказвае загаловак тэксту: на тэму ці на асноўную думку?

## На лясным возеры

Густы лес зялёнай сцяной акружыў возера. У паветры разліваецца пах лазы і балотнай травы.

Паверхня вады зарасла белымі гарлачыкамі. На адным з лістоў нерухома застыла зялёная жабка. Над кветкамі кружацца сінія стракозы.


Правообладатель Национальный институт образования

Ціхая азёрная вада напоўнена жыццём. У глыбіні снуюць прыгожыя рыбкі. Часам выплываюць з вады бліскучыя жукі-плывунцы́.



На колькі частак можна падзяліць тэкст? Пра што ідзе размова ў кожнай частцы?

Прачытайце план. Ці адпавядае паслядоўнасць пунктаў плана паслядоўнасці частак у тэксце? Як яе трэба змяніць?

План
1. Жыццё ў вадзе.
2. На паверхні возера.
3. Вакол возера.

Запішыце выпраўлены план. Да якой часткі тэксту прапанаваны малюнак? Спішыце першую частку тэксту.

**56.** Прачытайце. Што парушана ў тэксце?

## Лясная яблыня

Раптам на галіну села нейкая птушка і распачала знаёмства з яблынькай. Яна так клявала яблык, што некалькі кавалачкаў упалі на зямлю. Прыляцелі яшчэ некалькі птушак. Яны,


Правообладатель Национальный институт образования

мабыць, здагадаліся, што мы хочам выкапаць яблыню, і зляцеліся, каб апошні раз паласавацца сакавітымі пладамі.

Мне і брату расхацелася перавозіць дрэўца ў вёску. Яблыня лясным жыхарам патрэбна больш, чым нам.

Брат сказаў, што дзікія яблычкі становяцца смачнымі зімой. Тады я прапанаваў выкапаць яблыньку і перавезці ў наш сад. Валодзя пагадзіўся.

Мы з братам наткнуліся ў лесе на дзікую яблыню. Лісце яе пачало ападаць, а невялічкія яблычкі моцна трымаліся за галінкі. Я паспытаў адзін — ён быў цвёрды і кіслы. *(Паводле І. Муравейкі.)*

Аднавіце паслядоўнасць частак тэксту. Выкарыстайце прапанаваны план.

План

1. Што знайшлі хлопчыкі ў лесе?
2. Што яны захацелі зрабіць з яблынькай?
3. Хто прыляцеў частаваццаляснымі яблычкамі?
4. Чаму хлопчыкі пакінулі яблыньку ў лесе?

Вусна перакажыце тэкст.

На што ўказвае загаловак тэксту?

Запішыце сказ, у якім перадаецца асноўная думка тэксту.



Правообладатель Национальный институт образования

**57.** Вусна складзіце па падказках алгарытм пабудовы плана тэксту.

1. Чытаем ..., дзелім яго на сэнсавыя ... .

## Удод

Удод — крылаты прыгажун. На галаве ён мае жоўты чуб, які раскрываецца, нібы веер. На крылах і хвасце ўдода стракатае пер’е. Яно ўтварае выра́зныя чорна-белыя палосы.

Птушка ладзіць гняздо ў розных месцах. Яна селіцца ў дуплах дрэў, пад пнямі, у шпакоўнях, у гаспадарчых пабудовах.

Удод шмат часу праводзіць на зямлі. Там ён здабывае сабе корм. Сваёй доўгай дзюбай птушка палюе на павукоў, насякомых і нават на яшчарак.

2. Вылучаем галоўнае ў ... .

1. Удод — крылаты прыгажун. На галаве ён мае жоўты чуб, які раскрываецца, нібы веер. На крылах і хвасце ўдода стракатае пер’е. Яно ўтварае выразныя чорна-белыя палосы.

2. Птушка ладзіць гняздо ў розных месцах. Яна селіцца ў дуплах дрэў, пад пнямі, у шпакоўнях, у гаспадарчых пабудовах.

3. Удод шмат часу праводзіць на зямлі. Там ён здабывае сабе корм. Сваёй доўгай дзюбай птушка палюе на павукоў, насякомых і нават на яшчарак.



Правообладатель Национальный институт образования

3. Даём назву ... .

План
1. Крылаты ... .
2. Гняздо ... .
3. Палюе ... .



**58.** Запішыце план тэксту з практыкавання 57.

**План** — гэта кароткая праграма, якую трэба намеціць пры падрыхтоўцы да сачынення, паведамлення, пераказу.

Рм **59.** Прачытайце тэкст.

### Адказны за прыроду

Алёшка вучыцца ў трэцім класе. Яго прызначылі адказным за прыроду. Аднак ніякай прыроды ў класе няма.

Ды хлопчык знайшоў сабе работу. Не ўсе птушкі ляцяць у вырай. Вераб'і, сініцы, снегіры застаюцца зімаваць. Некаторыя гінуць.

Алёшка вырашыў дзейнічаць. Ён стварыў сталоўку для птушак. На сасне і бярозе прыладзіў дошчачкі на шнурках. На дошчачкі хлопчык сыпаў хлебныя крошкі, крупы.

Птушкі прыпіса́ліся да сталоўкі. Кожны дзень дошчачкі чыстыя. *(Паводле І. Навуменкі.)*



Правообладатель Национальный институт образования

Чаму Алёшу можна назваць адказным чалавекам? Якую добрую справу ён сам вырашыў зрабіць? Як выглядала сталоўка для птушак? Якія словы тэксту падказалі вам, што сталоўка спадабалася птушкам?

На што ўказвае загаловак тэксту: на тэму ці на асноўную думку? Прыдумайце іншы загаловак да тэксту. На што ён указвае?

Падзяліце тэкст на часткі. Складзіце і запішыце яго план.

Вусна перакажыце тэкст па плане, выкарыстаўшы прапанаваныя словы і спалучэнні слоў.

Словы для даведкі:

1) *вучыцца **ў** трэцім класе, прызначылі, прыроды няма*;

2) *знайшо**ў** работу, ля**ц**я**ць** **у** вырай, застаюцца зімава**ць**, гіну**ць***;

3) *вырашы**ў** **дз**ейніча**ць**, ствары**ў** стало**ў**ку, пры**ладз**і**ў** дошчачкі, сыпа**ў** крошкі, крупы*;

4) *прыпісаліся да стало**ў**кі, ч**ы**стыя*.

Растлумачце правапіс выдзеленых літар у словах.

**60.** Прачытайце прыказкі. Чаму так гавораць?

Дзве работы за раз не зробіш.
Пчолка маленькая, а мёду колькі наносіць!
Па рабоце майстра відаць.

Якія з прыказак падыходзяць для характарыстыкі галоўнага героя тэксту з практыкавання 59?



Правообладатель Национальный институт образования

Рм **61.** Уявіце сябе журналістамі. Вам трэба ўзяць інтэрв'ю ў незнаёмага чалавека і даведацца пра яго любімы занятак. Запішыце пытанні ў патрэбнай паслядоўнасці.

У чым яго карысць? Які ваш любімы занятак? Чаму вы параілі б заняцца гэтым вашым знаёмым?

План

1. ...
2. ...
3. ...

Падрыхтуйце вуснае паведамленне пра свой любімы занятак, адказаўшы на гэтыя пытанні.

Рм **62.** Выкарыстаўшы план з практыкавання 61, вазьміце інтэрв'ю ў аднакласніка. Папярэдне прадумайце, як пачаць размову. Разыграйце яе ў парах.

***Творчая хвілінка***

Раскажыце, што вы ведаеце аб прафесіі журналіста. Як бяруць інтэрв'ю? Пры неабходнасці запытайцеся ў бацькоў або знайдзіце патрэбныя звесткі ў інтэрнэце.

Рм **63.** Выкарыстаўшы план з практыкавання 61, складзіце і запішыце паведамленне на тэму «Любімы занятак вучняў нашага класа». Калі такога агульнага занятку ў вас яшчэ няма, падумайце і раскажыце, чым бы вы хацелі займацца ўсе разам.



Правообладатель Национальный институт образования

**64.** Расшыфруйце словы. Лічба ў клетцы ўказвае на парадкавы нумар літары ў алфавіце. Што аб’ядноўвае гэтыя словы?

| | | | |
|---|---|---|---|
| 20 | 30 | 14 | 1 |

| | | | |
|---|---|---|---|
| 17 | 13 | 1 | 15 |

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 9 | 1 | 4 | 1 | 13 | 16 | 3 | 1 | 12 |

**65.** Прачытайце тэкст. Якую добрую справу зрабілі дзеці? Як гэта характарызуе іх?

## Дашына аб’ява

Да бра́мкі нашага двара колькі дзён за́пар падыходзіў чорны-чорны, высокі і прыгожы сабака. Ён лажыўся на траўку і чакаў якога-небудзь нае́дку.

Дзеці першыя пра гэта здагадаліся і, назваўшы сабаку Чарлі, пачалі падкармліваць яго. Сабака з ахвотай прымаў ласункі і адзываўся на дадзенае яму імя.

Адна з унучак гаспадара двара, Даша, вырашыла дзейнічаць. Узяла ліст тоўстай паперы, каляровыя алоўкі і напісала аб’яву: «Чорны, высокі, з белай плямай на лбе сабака, адзываецца на клічку Чарлі, шукае гаспадара». *(Паводле П. Кавалёва.)*



Правообладатель Национальный институт образования

**бра́мка** — веснічкі (*рус.* калитка)
**за́пар** — *рус.* подряд
**нае́дак** — *тут:* ежа

Падзяліце тэкст на часткі. Складзіце і запішыце яго план.

## ПРАВЕРЦЕ СЯБЕ

### *Адкажыце на пытанні*

1. Што такое тэкст?
2. На што можа ўказваць загаловак тэксту?
3. Што такое тэма тэксту?
4. Што такое асноўная думка тэксту?
5. Што раскрывае і перадае план тэксту?
6. Як скласці план тэксту?

### *Творчая хвілінка*

Уявіце сябе пісьменнікамі. Вам трэба скласці казку, загалоўкам якой будзе наступная прыказка.

Кошка мышцы не таварыш.

Пра каго можна так сказаць? На што будзе ўказваць такі загаловак казкі: на тэму ці на асноўную думку тэксту?

Складзіце і запішыце план вашай казкі.

Прыдумайце казку і раскажыце яе аднакласнікам.


Правообладатель Национальный институт образования